# ПРАЗ ПАЦІНУ ЧАСУ – У СЭРЦЫ ЛЮДЗЕЙ

**НАВАГРУДАК. 20 верасня ў Навагрудскай раённай бібліятэцы адбылася прэзентацыя новай кнігі Святланы Кошур «Праз пацiну часу. Сцежкамі свiцязянскай зямлі» (Мінск, РВУ «Звязда», 2023).**




Член Саюза пісьменнікаў Беларусі, вядомая ў краіне краязнаўца, Святлана Андрэеўна Кошур *(на фота)* – двойчы лаўрэат Прэміі імя А. І. Дубко за дасягненні ў галіне культуры і мастацтва, адзін з найбольш дасведчаных, аўтарытэтных спецыялістаў у сваёй справе. На старонках аўтарскіх краязнаўчых артыкулаў, дакументальна-публіцыстычных нарысаў пісьменніца гарманічна спалучае глыбіню навуковага даследавання са змястоўнасцю мастацкага аповеду, пільную ўвагу да мінулага са шчырай любоўю да роднай зямлі і людзей, што пакінулі на ёй свой след. Але пачуцці неабходна падмацоўваць ведамі. У гэтым філасофская стратэгія краязнаўства. Без ведання свайго мінулага немагчымы рух у будучыню. Новую працу, як і большую частку сваёй творчасці, Святлана Кошур прысвяціла малой радзіме, Навагрудчыне, апетаму ў радках класікаў чароўнаму Свіцязянскаму краю. У цэнтры ўвагі даследчыка – гістарычная і культурная спадчына гэтых мясцін, таямніцы мінулага, постаці і лёсы людзей. Старонкі кнігі – поўныя шчырых пачуццяў і драматызму сюжэты, павучальныя гісторыі жыцця ўраджэнцаў і жыхароў Навагрудчыны некалькіх пакаленняў.

Са зместам сваёй новай кнігі пісьменніца падрабязна пазнаёміла зацікаўленую аўдыторыю. На сустрэчу з новай кнігай завіталі прадстаўнікі культурнай грамадскасці горада – навучэнцы і педагогі Навагрудскага дзяржаўнага каледжа тэхналогій і бяспекі, ветэраны працы, навуковыя супрацоўнікі Дома-музея Адама Міцкевіча. У якасці гасцей у прэзентацыі прынялі ўдзел член Рады Беларускага фонда культуры, гісторык, краязнавец Мікалай Гайба і госць з Гродна, намеснік старшыні ГрАА СПБ, паэт, публіцыст Дзмітрый Радзівончык. У адказнай ролі гасціннай гаспадыні і вядучай імпрэзы выступіла дырэктар Навагрудскай раённай бібліятэкі Ірына Міхайлаўна Царук.



Так, творы краязнаўцы Святланы Кошур знаёмяць чытача з маляўніча адлюстраваным у часе культурна-гістарычным ландшафтам аднаго з рэгёнаў Беларусі. Але пры бліжэйшым разглядзе пераконваешся, што гучанне жыццёвых матываў новай кнігі значна больш магутнае і сваёй маштабнасцю пераўзыходзіць межы нашай краіны. Даніна памяці і павагі аддадзена ў кнізе вобразам землякоў, якія ваявалі на франтах Вялікай Айчыннай вайны, удзельнічалі ў вызваленні Беларусі і разгроме фашысцкай Германіі. Сярод іх славутыя палкаводцы і простыя салдаты, якія не пашкадавалі свайго жыцця за Перамогу, за народнае адзінства і шчаслівы лёс нашчадкаў.






«У працэсе працы над матэрыялам я зразумела, што люблю сваіх герояў, – прызнаецца Святлана Андрэеўна, – Бо толькі любоў да сваёй справы, да роднай зямлі дазваляе праліваць святло на старонкі нашага мінулага, дапамагае пераадольваць шлях да гістарычнай праўды, якім бы ён ні быў доўгім і цярністым». Невыпадкова ў назве кнігі аўтарам згадваецца сімвалічная прыродная з'ява – паціна часу – налёт, які з-за акіслення паступова пакрывае паверхню каштоўных металаў. Знаёмства з новай, дзесятай па ліку кнігай Святланы Кошур пацвярджае: творчае сумленне даследчыка і зацікаўленасць чытача надаюць айчыннай гісторыі ўстойлівасці да выпрабаванняў часам.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**Гродзенскае абласное аддзяленне**

**На фота:** прэзентацыя кнігі Святланы Кошур «Праз паціну часу. Сцежкамі свіцязянскай зямлі». Навагрудак, раённая бібліятэка. 20 верасня 2023 года.




РЭСПУБЛІКА
БЕЛАРУСЬ


РЭСПУБЛІКА
БЕЛАРУСЬ
ЗЯМЛЯ
КРАЙ


Праз
пацiну
часу
РЭСПУБЛІКА
БЕЛАРУСЬ


РЭСПУБЛІКА
БЕЛАРУСЬ
КРАЙ


РЭСПУБЛІКА
БЕЛАРУСЬ
ЗЯМЛЯ
STYLE


ЗЯМЛЯ






***Фота*** Святланы ЧУБРЫК [Пра падзею на сайце Навагрудскай раённай бібліятэкі]